ка (I,73), матэматыка (I,74).

У цэлым у даследваных намі студэнтаў факультэта бібліятэказнаўства і бібліяграфіі можна адзначыць яўна выяўленую гуманітарную накіраванасць. Яна яўна пераважае сялянскую, матэматычную, прагматычную.

Такая накіраванасць сведчыць аб тым, што, не гледзячы на нізкі прэстыж бібліятэчнай прафесіі, яе набыцце з'яўляецца для студэнтаў безумоўнай каштоўнасцю, таму што стварае добрыя падставы для актыўнага, заінтэрэсаванага удзелу будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў у вучэбным працэсе.

## БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ТРАДЫЦЫІ І ІХ МЕСЦА У РАЗВІЦЦІ МАРАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ АСОБЫ

Л.М.Рогачова

Накапленне гістарычных ведаў аб сваім народзе, вывучэнне яго традыцый, асэнсаванне этнічнай спецыфікі ў галіне фальклору, народнага мастацтва, звычаяў і абрадаў аказваюць непасрэднае ўздзеянне на нацыянальную самасвядомасць народа, садзейнічаюць захаванню яго нацыянальнай самабытнасці.

Асаблівую актуальнасць гэтая праблема набыла сення, калі на першы план грамадскага і палітычнага развіцця рэспублікі вылучаюцца пытанні культурнага адраджэння беларускага народа, паўстае неабходнасць распрацоўкі новае канцэпцыі выхавання падрастаючага пакалення.

Пануючыя ў папярэднія дзесяцігоддзі стэрэатыпы у арганізацыі сістэмы выхавання разглядалі працэс выхавання асобы праз прызму палітыка-ідэалагічных структур. Гэткая практыка прывяла да нівеліравання асабістых характарыстык чалавека у маштабе былога Саюза, падаўленню нацыянальнай самабытнасці выхаваўчай сістэмы беларускага народу, да забыцця і страты яе нацыянальных рыс.

Пераадоленне гэтых негатыўных з'яў шчыльна звязана з далучэннем моладзі да багацейшай спадчыны нацыянальнай культуры, якая стваралася на працягу шматстагоддзяў і увайшла у скарбон-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ку сусветнае культуры. Адной з яе невыключальных частак з'яўляецца народная педагогіка, якая прадстаўляе каштоўную крыніцу выхаваўчага вопыту, выпрацаванага народам на працягу усёй сваёй гісторыі і зафіксаванага ў вуснай народнай творчасці, традыцыях, звычаях, абрадах, гульнях і г.д.

Асаблівая значнасць народных педагагічных поглядаў у адраджэнні нацыянальнай свядомасці народа абумоўліваецца пэўнымі складанасцямі гістарычнага развіцця Беларусі. Забаранёнене роднае мовы, закрыццё нацыянальных школ, апалячванне, а потым русіфікацыя, у першаю чаргу нацыянальнай інтэлігенцыі, абумовілі той факт, што народная творчасць станавілася адзінай формай адлюстравання жыццёвых, грамадскіх і духоўных патрэб народных мас, захоўваючы пры гэтым нацыянальную самабытнасць выхаваўчага ідэяла.

Як сведчыць аналіз прац па гісторыі і этнаграфіі беларусаў, вывучэнне вуснай народнай творчасці, у беларускай народнай педагогіцы склаўся выразны ідэал дасканалага чалавека, які трэба разглядаць як сумарнае уяўленне мэтаў народнага выхавання. Характэрнымі рысамі гэтага ідэала з'яўляюцца яго агульначалавечыя цэнасныя арыентацыі: любоў да роднага краю, да зямлі, працавітасць, гуманнасць у адносінах з навакольнымі.

Асновай гэтых поглядаў выступае фарміраванне маральных прынцыпаў асобы, бо мараль - адна з найбольш ранейшых форм грамадскага ўсведамлення. Яе найважнейшай сутнаснай рысай напрацягу усяе гісторыі беларускага народу з'яўляецца гуманізм. У народным выхаванні гэты крытэрый выконваў ролю меры, якая абкрэслівала задачы, змест і шляхі маральнага выхавання падрастаючага пакалення. Вопыт фарміравання гуманнасці асобы народ зафіксаваў у шматлікіх прымаўках і прыказках, якія і сення не страцілі сваей выхаваўчай сілы.

Другім вядучым крытэрыем маральнасці заўседы з'яўлялася любоў да працы. Гэта заканамерна, бо у працы людзі уступаюць у самыя шматбаковыя адносіны друг з другам, з наваколлем. У народных казках любоў да працы з'яўляецца адлюстраванне ідэальнага у чалавеку, ўвасабляе яго духоўнаю прыгажосць. Разам з тым, традыцыйныя народныя характэрыстыкі асобы, падкрэсліваючы галоўныя рысы, разумелі пад імі усе багацце станоўчых якасцей. Так, казачны "добры маладзец" разам з любоўю да працы, ўвасаб-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ляе такія рысы, як удаласць, храбрасць, часнасць, сумленнасць. Таму вобраз "добрага малайца" з поўным правам выступае у народным выхаванні як узор для пераймання.

Праца, як вядучая форма дзейнасці чалавека, фарміруе самаразуменне асобы, вызначае ле маральныя пазіцыі ў калектыве. Гэта старонка выхавання так сама багата адлюстравана у беларускім фальклоры (напрыклад, у каляндарна-земляробчым цыкле абрадаў і святаў). Спрадвеку ўшаноўваліся ў народнай педагогіцы калектыўная праца, гатоўнасць да дапамогі, падтрымкі, што яскрава адлюстравана ў так званых "Талочных песнях".

Магутнасць выхаваўчага ўздзеяння педагагічных традыцый народа шмат у чым вызначаецца іх багатай эстэтычнай змястоўнасцю. Таму у этнапедагогіцы вялікая роля адводзіцца эстэтычнаму пачатку, калі педагагічныя ідэі і усведамленні увасабляюцца у канкрэтна-пачуццевую сімвалічную форму і праз эмацыянальныя і эстэтычныя адчуванні глыбока ўсвойваюцца асобай падсвядома, становячыся натуральнай нормай паводзін. Каляды, гуканне вясны, купалле, зажынкі – гэта непаўторныя па сваей дасканаласці рытуальных дзеянняў і эмацыянальнаму уплыву тэатралізавання сцэны народнага жыцця.

Такім чынам, знаемства з выпрабаванай стагоддзямі педагагічнай спадчынай народа сведчыць аб яе невычарпальных магчымасцях у справе выхавання падрастаючага пакалення. У гэтай сувязі, на наш позірк, пашыранае вывучэнне выхаваўчага вопыту, ўкараненне яго у штодзенную дзейнасць дасць новыя уплывы адраджэння нацыянальнай свядомасці беларускага народа.

## НЕКАТОРЫЯ МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ДАСЛЕДВАННЯ МАСТАЦКАЙ АДОРАНАСЦІ

В.Я.Баклагіна

Уступая у свет, адораны чалавек не проста авалодвае прадметамі культуры і сродкамі дзейнасці, але і спрабуе пранікнуць у іх глыбінную, усеагульную сутнасць, эмпірычна неўлоўленую у яго вопыце.